Свіслацкая
цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Поразаўская бібліятэка-цэнтр краязнаўства

Помнікі гісторыі і культуры



# Сядзіба “Багудзенкі”

Сядзібна-паркавы комплекс XIX ст.

Згодна мясцовай легендзе, сваёй арыгінальнай назвай сядзіба абавязана... Адаму і Еве. Пасля выгнання з раю і доўгай вандроўкі, стомленыя, яны ўрэшце спыніліся на ўзгорку пад бярозкамі і радасна ўсклікнулі: “Богу дзякуй, (Богу дзенкі), ужо відаць Поразава”. Адсюль і Багудзенкі.

Уладальнікам сядзібы быў Тадэвуш Бутаўт-Анджэйковіч, а апошнім - сын Вітольд, які быў забіты ў 1945 годзе пры разбойным нападзе, калі вяртаўся ўначы з чамаданамі ў руках у нанятую ім кватэру.

Маёнтак належаў Бутаўт-Анджэйковічам здаўна, хоць ёсць згадванне, што ў 1845 годзе ўладальнікам гэтага маёнтка быў Іосіф Калянкевіч.

Тадэвуш Бутаўт-Анджэйковіч пабудаваў у сярэдзіне XIX стагоддзя ў Багудзенках прасторны сядзібны жылы дом з вялікай колькасцю карнізаў, аканіцаў, вежак, а таксама гаспадарчыя пабудовы і пры гэтым залез у даўгі. Гэта быў чалавек з велізарнымі амбіцыямі і, падобна, вялікі марнатраўца. Новы сядзібны дом яму будаваў У.А.Чантурыя.



Плошча дома – каля 500 квадратных метраў. Гаспадар маёнтка, Тадэвуш, быў адным з найбагацейшых памешчыкаў Гродзеншчыны. Ён адным з першых набыў аўтамабіль і, кажуць, аднойчы ездзіў на ім абедаць у Варшаву.

Памёр Тадэвуш Бутаўт-Анджэйковіч нечакана і пры таямнічых акалічнасцях, і сям’я захоўвала маўчанне на гэты конт.

Дом, узведзены з драўляных брусоў, уяўляе сабой прамавугольны будынак пад высокім ламаным дахам. Невялікія алькежы – вежачкі ў тарцах будынка ўвенчаны востраканечнымі шатрамі з фігурнымі шпілямі. У ніжніх

паверхах алькежаў – уваходы ў дом, а на верхніх – утульныя пакоі з балкончыкамі.

На фоне асноўнага аб'ёму сядзібнага дома вылучаецца шацёр цэнтральнага гранёнага мансардавага рызаліта.



Над галоўным уваходам, які афармлены чатырохкалонным ганкам, змяшчаецца тэраса з парапетам. Цэнтральную частку дома займала анфілада парадных залаў, якую пазней змяніла калідорная планіроўка.

Найбольш адметна выглядаюць пакоі з боку парку. Яны маюць гранёныя выступы, сцены якіх амаль поўнасцю складаюцца з вокнаў. Багата і разнастайна выкарыстана ў афармленні дома разьба па дрэве. Фасады аздабляюць балясіны, разныя валюты, фігурныя ліштвы аконных праёмаў.





На старым сядзібным двары засталіся фрагменты даваеннага парка, прадстаўленага старымі ліпамі і каштанамі, а таксама шырокая выязная алея.



Маёнтак Багудзенкі не адносіўся да вялікіх і меў ў 1924 годзе 375 гектараў зямлі.

У даваенны перыяд маёнтак быў падзелены. У 1937 годзе сядзібны двор (жылы будынак, гаспадарчыя пабудовы і 120 гектараў зямлі

выкупілі за 120 000 злотых жыхары Поразава (а дакладней, гміна). Гэтую суму гміна выручыла, прадаўшы лес “Бродкі”, які ёй належаў. Як успамінае ўдзельнік гэтых падзей Станіславаў Іванавіч Крыцкі (ён, дарэчы, вёз з Свіслачы купца са 120 000 злотых, атрыманых у банку Свіслачы), на зборы жыхароў Поразава было прынята рашэнне стварыць у маёнтку Багудзенкі, які быў агульнай уласнасцю, шпіталь і прыёмную, а таксама прадаставіць жыллё для ўрача.

Зямля была падзелена паміж жыхарамі мястэчка, якія займаюцца сельскай гаспадаркай. Велічыня надзелу залежала ад сумы падатку, які плаціў гаспадар. 5 гектараў зямлі гміна пакінула за сабой, разлічваючы пабудаваць на ёй школу, аптэку і будынак гміны. Аднак падзеі верасня 1939 года парушылі гэтыя планы.

У канцы 1939 года тут усё ж была створана лякарня. Частку двара заняла воінская часць.

У чэрвені 1941 года ў выніку баёў за Поразава з’явіліся пагарэльцы, якія і размясціліся тут. Аднак неўзабаве іх папрасілі вызваліць будынак для нямецкага лясніцтва.

Адразу пасля вайны і да апошняга часу ў Багудзенках была бальніца. У 2011 годзе сядзібу выкупілі, аднак пакуль намаганняў руплівых гаспадароў па выратаванні будынка не відаць.

Сядзібны дом – помнік архітэктуры з рысамі барока і класіцызму.

